Таким образом, Витебск в полной мере можно назвать одним из знаковых городов войны 1812 года на территории Российской империи. Он располагает памятниками, связанными с событиями войны, которые имеют огромную туристскую привлекательность для посетителей города. Всё это позволяет говорить о событиях войны 1812 г. в Витебске как о потенциальном ресурсе для развития культурно-познавательного и событийного туризма.

**М.В. Півавар**

## МЕСЦЫ, ЗВЯЗАНЫЯ З 1812 ГОДАМ, У НАВАКОЛЛЯХ ВІЦЕБСКА

Вайна 1812 г. паміж напалеонаўскай Францыяй і Расійскай імперыяй з’яўляецца адной з тых падзей, якая змяніла ход сусветнай гісторыі. Параза ў гэтай вайне спыніла пераможнае дасюль шэсце французскай зброі, стала каталізатарам нацыянальна-вызвольных паўстанняў у краінах Еўропы, прычынай стварэння VI антынапалеонаўскай кааліцыі, якая прывяла да паражэння Францыі і фактычна да завяршэння щ 1815 г. эпохі кровапралітных напалеонаўскіх войнаў. Можна казаць, што пагібель напалеонаўскай Вялікай арміі, крах напалеонаўскай імперыі, а з ёй і планаў імператара французаў аб сусветным валадаранні адбыліся на палях сучаснай Беларусі і Расіі. Менавіта тут на пачатку XIX ст. вырашыўся лёс свету.

Але лёсавызначальнасць дорага каштуе. Для беларускіх зямель, якія сталі асноўнай арэнай баявых дзеянняў вайна прынесла незлічоныя беды іх насельніцтву, каласальныя матэрыяльныя і духоўныя страты. У выніку ваенных дзеянняў, грабяжоў, марадзёрства, хваробаў, голаду, рэквізіцый насельніцтва беларускіх зямель скарацілася на адну трацiну. Можна казаць пра тое, што для мясцовага насельніцтва канфлікт насіў рысы грамадзянскай вайны, таму, што жыхары беларускіх зямель змагаліся як на баку расійскіх войскаў, так і ў напалеонаўскай арміі. Пасля перамогі рускай зброі значная частка мясцовай шляхты вымушана была з’ехаць на эміграцыю, каб пазбегнуць рэпрэсій з боку пераможцаў. Разарэнню падвергліся практычна ўсе рэгіёны краіны, але найбольш пацярпела Віцебшчына. Зразумела, што асвятленне падзей звязаных з вайной мае надзвычай важнае значэнне.

Тэма войны 1812 г. знашла своё адлюстраванне як у навуковай, навукова-папулярнай, мастацкай літаратуры, так і ў творах жывапісу, скульптуры, архітэктуры, а таксама музычных творах. Якія ж сляды вайны захаваліся ў памяці народа і дайшлі да нашых дзён праз легенды і паданні, казкі, назвы месцаў. Адлюстраванні вайны 1812 г. у памяці народа – мэта гэтага артыкула. У пераліку мы не спынімся толькі на духоўных помніках, але прыгадаем і матэрыяльныя ўвасабленні памяці народа – помнікі, будынкі і інш.

Напэўна, найбольш цікавым і арыгінальным аб’ектам, які ў памяці народа звязваецца з падзеямі 1812 г. з’яўляецца Напалеонаўская дарога (Напалеонаўска трапа) на возеры Лосвіда, якое знаходзіцца на мяжы Гарадоцкага і Віцебскага раёнаў. Возера Лосвіда вельмі глыбокае. У паўднёва-ўсходняй частцы ёсць месцы, дзе глыбыня больш за 20 метраў. У паўночнай частцы возера ўтварае луку, якая называецца Малое Лосвіда. Тут з аднаго на другі бок можна перайсці, як кажуць мясцовыя жанчыны “не замачыўшы спадніцы”. Гэтае месца называюць Напалеонаўскай дарогай, ці Напалеонаўскай трапой.

Згодна з паданнем, у 1812 годзе ў гэтым месцы войска французаў разам з Напалеонам было абкружана рускай арміяй. Уначы да Напалеона прыйшоў д’ябал і прапанаваў уратавацца ад немінучай гібелі ці палону. Калі імператар пагадзіўся, нячысты загадаў жаўнерам шапкамі насіць зямлю ў возера. У выніку чараўніцтва,



Репозиторий ВГУ

у гэтым месцы ўтварылася падводная “дарога”, па якой французы змаглі перайсці возера і выратавацца ад рускага войска [1].

Французскія магілы. Традыцыйна з вайной 1812 г. звязваюць курганныя групы і асобныя курганы, якія мясцовыя жыхары называюць французскімі. Па-даўляючая большасць з іх ніяк не звязана з падзеямі вайны, хаця народная малва ўпорна атаесамляе курганы з насыпамі над магіламі салдат, якія загінулі ў жорскіх баях. У наваколлях Віцебска ёсць некалькі месцаў, якія легендарна маюць французскую прывязку. Напрыклад, “французскія могілкі” ва ўрочышчы “Какоўка” (Какоўка), за 1 км на паўднёвы ўсход ад вёскі в. Сакольнікі Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна. У ім знаходзіцца курганны могільнік, які складаецца з 57 насыпаў вышынёй 1–1,5 м, дыяметрам 5–7 м. Існуе паданне, што ў часы вайны 1812 года каля Сакольнікаў быў бой, у якім загінула шмат французаў, якія былі пахаваны ў курганах [2]. Ва ўрочышчы ў канцы XIX ст. была дача вядомага беларускага гісторыка А.П. Сапунова. Не менш вядомы гісторык – Е.Р. Раманаў праводзіў тут раскопкі, вынікі якіх захоўваюцца ў Маскве. І даўнія раскопкі і сучасныя даследаванні (1972 г. – Г.В. Штыхаў, 1981 г. – Л.У. Калядзінскі) дазваляюць сцвярджаць, што могільнік не мае дачыненне да французаў, а пахаваны тут крывічы, якія жылі ў VIII–XII стст. Назва французскія магілы (курганы) зафіксавана непадалёк ад в. Малыя Лётцы.

Вялізны курган, які называюць “французская магіла” ёсць на самым беразе Дзвіны насупраць *в. Хатоля* Курынскага с/с Віцебскага раёна.

Захаваліся ў народзе легенды і паданні, якія звязваюць з вайной 1812 г. Цікавае паданне пра гарадзішча запісана ў *в. Лужасна* Віцебскага раёна. Легенда сцвярджае, што ў 1812 г. мясцовыя памешчыкі схавалі сваё дабро ад французаў на востраве пасярод возера (на сённяшні дзень востраў – гэта гарадзішча, якое і цяпер узвышаецца пасярод тарфянога балота, што тысячы (але не сотні) гадоў таму магло быць возерам). Шлях да схаваных скарбаў вёў праз зачыненую жалезную дзвер. Па нейкай прычыне, скарбы так і не былі забраны, а жалезную дзвер бачылі яшчэ і недаўна, але адчыніць яе немагчыма, бо яна зачараваная [3]. Археалагічныя раскопкі, якія праводзіў каля Лужасна Г.В. Штыхаў у 1972 і 1974 гг. скарбаў не выявілі, а пацвердзілі існаванне тут гарадзішча і селішча перыяду ранняга жалезнага веку днепра-дзвінскай, потым банцараўскай археалагічнай культуры.

У тым жа Лужасна распавядаюць яшчэ адно паданне, якое мае дачыненне да падзей 1812 г. Яно мае звязана з царквой Узвіжання Крыжа Гасподняга. Мясцовая памешчыца (у іншых варыянце расповядаў памешчыкі) дала зарок, што калі французы не парабуюць маёнтак и маёмасць, то будзе ўзведзена каменная царква. Час узвядзення капліцы прыблізна супадае і ў дакументах пазначаны як 1815 г. [4].

Да легендарных аб’ектаў аднясем возера Валконка ў Віцебскім раёне, пра якое існуе легенда, што менавіта ў ім адступаючыя войскі Напалеона схавалі скарбы, нарабаваныя ў Маскве [5].

Да легендарных, але маючых пэўнае пацверджанне ў дакументальных крыніцах можна аднесці дуб Напалеона ў Бешанковічах. Адпаведна вуснай традыцыі менавіта пад дубам імператар французаў адпачываў, калі праязджаў праз Бешанковічы. Існуе і згадка ў мемуарах пра тое, што нямецкі мастак Адам Альбрэхт пісаў партрэт імператара, калі той адпачываў пад вялікім дрэвам. У любым выпадку вялізнае дрэва вартае аховы, калі не як помнік гісторыі, пра якое існуе паданне, дык як помнік прыроды. Па-першае, гэта вялікаўзроставае дрэва, якое з’яўляецца высокадэкаратыўным элементам ландшафта. З улікам агульнага фону растроеных дрэвастояў у выніку бессістэмных высечак такое вялікае дрэва з’яўляецца важным эстэтычна-атракцыйным элементам пейзажу. Яно з’яўляецца



Репозиторий ВГУ

важным асяродаўтваральным элементам, прысадай для рэдкіх, каштоўных птушак (арол-маркут, скапа), пералётных чарод лясных вераб'іных птушак. Акрамя таго, – гэта каштоўнае дрэва-матачнік мясцовай папуляцыі *Quercus robur* і высокабанітэтны экзэмпляр свайго віду. На жаль, высілкамі мясцовай адміністрацыі дуб вельмі моцна пашкоджаны і яго існаванне пад пагрозай. Але ў Бешанковічах захаваўся палац Храптовічаў, у якім спыняўся на начлег Напалеон. Цяпер у былым палацы школа мастацтваў. Будынак – прыклад архітэктуры класічнага стылю. Варта прыгадаць яшчэ адзін палац, – палац Цэханавецкіх, у якім таксама спыняўся Напалеон быў у м. Бачэйкава.

Найбольш вядомым месцам, звязаным з падзеямі вайны 1812 г., якія знайшлі адлюстраванне ў літаратуры і займелі сусветную знакамітасць з'яўляюцца в. Астроўна, Кукавячына, Дабрэйка. Тут ў ліпені 1812 г. адбылася бітва, якая ўвайшла ў рускую гістарыяграфію як Астровенская, а ў французскай больш вядома як Віцебскі бой.

Менш вядомы, але адзначаны помнікам з'яўляецца бой каля в. Вароны. Ён адбыўся ў кастрычніку 1812 г. у быў пераможным для рускага войска. У 1912 г. тут быў узведзены помнік на месцы бою 1812 г., дзе рускі атрад уланаў Ямбурскага палка, пад камандаваннем падпалкоўніка Сталыпіна разбіў французскі ар'ергард і ўзяў у палон 400 салдат і генерала Пушэ [6].

Сталое пакаленне добра памятае фільм "Гусарская балада", зняты Э. Разанавым. Галоўная гераіня карціны – Шурачка Азарава, якая выдала сябе за мужчыну, служыла ў гусарскім палку, брала ўдзел у вайне 1812 г. мела рэальнага прататыпа – Надзею Дураву. У мясцэчку Янавічы, цяпер гарадскі пасёлак у 30 кіламетрах ад Віцебска некаторы час праходзіла службу гэтая "кавалерыст-дзявіца" [7].

У в. Кісялі Гарадоцкага раёна на мясцовых могілках (былое гарадзішча, вельмі маляўнічае месца, якое мясцовыя жыхары называюць "Прыстань") спачывае ўдзельнік ваеннай кампаніі 1812 г., удзельнік замежнага паходу рускага войска – палкоўнік Карпаў [8]. Ягоныя мемуары, выдадзеныя пад назвай "Запіскі палкоўніка Карпава" былі выдадзены ў адным з тамоў "Полоцко-Витебской старины", падрыхтаваных Віцебскай вучонай архіўнай камісіяй.

Такім чынам, можна зрабіць вывады аб тым, што падзеі вайны 1812 г. пакінулі пэўны след у памяці народа: тапонімах, легендах, паданнях, помніках археалогіі, а таксама матэрыяльных увасабленнях памяці народа.

Назва "французскія" звязана з тым, што ў народнай памяці нешта значнае, але не зразумелае, як правіла атаесамляецца з апошнімі катастрафічнымі падзеямі, якія мелі месца ў гісторыі краю. Для Віцебшчыны, гэта вайна 1812 г. На Палессі, якое амаль не закранулі падзеі гэтай вайны больш памятны ў народнай традыцыі (больш падсвядома, канешне) падзеі Паўночнай вайны (1700–1721 гг.), а дакладней 1707–1708 гг, калі адбываліся асноўныя ваенныя дзеянні паміж варагуючымі бакамі. Паход суправаджаўся ваеннымі сутыкненнямі, грабяжамі, марадзёрствам, ад якога цярпела мясцовае насельніцтва. Яны пакінулі спусташэнні, прывялі да голаду. Таму курганы, якія, дарэчы часцей называюць – капцы, а не так, як на Віцебшчыне – валатоўкі, у некаторых месцах называюць шведскія магілы. На Пскоўшчыне, курганы – польскія магілы. Такое ж тлумачэнне, на нашу думку, маюць і іншыя тапонімы, легенды, паданні, якія ў народнай памяці звязаны вайной 1812 г.

Гэта далёка не ўсе ўвасабленні народнай памяці пра падзеі вайны 1812 г., якія адбіліся ў памяці народа. У далейшым, варта пашырыць кола крыніц і аб'ём працы. Думаем, што прагляд прац дарэвалюцыйных аўтараў дапаможа выявіць цікавыя факты, прывязаныя да пэўнай мясцовасці ў наваколлях горада. Неабходна

Рэпазіторый ВДУ

працягваць выяўленне паданняў, легенд. Мэтазгодна даць агульны агляд вайны, прыгадаць месцы, дзе ночылі вядомыя асобы як кропкі, дзе прыймаліся важныя, лёсавызначальныя рашэнні. Пры апісанні цікавых аб’ектаў, варта падаваць не толькі іх апісанне, але інфармацыю, як да іх дабрацца, пра турыстычную інфраструктуру.

1. Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы / І.А. Абрамава [і інш.]; уклад. М. В. Півавар. – Мінск: Паркус плюс, 2008. – С. 203–204.
2. Півавар, М.В. Туристическо-краеведческая экскурсия по пойме Лужеснянки к усадьбе Сапунова в урочище Каховка / М.В. Півавар // 90 гадоў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі: матэрыялы навуковай канферэнцыі, Віцебск, 24 лістапада 1999 г. – Мн.: БелНДІДАС, 2000. – С. 81–85.
3. Півавар, М. Адкуль у нас з’явіліся маскалі” / М. Півавар // Народнае слова. – 1998. – 22 кастрычніка. – С. 6.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 1416. – Воп. 2. – Спр. 9287. – Арк. 304. Рапорт Витебского уездного предводителя Витебскому губернскому правлению от 30 октября 1851 г. об улучшении быта сельского православного духовенства.
5. Півавар, М. Легенды і паданні / М. Півавар // Жыццё Прыдзвіння. – 2003. – 9 жніўня, 19 жніўня, 2 верасня.
6. Збор помнікаў гісторыі і культуры. Віцебская вобласць. – Мн.: Беларус. Сав. Энцыклапедыя, 1985. – С. 183.
7. Подлипский, А. Кавалерист-девица / А. Подлипский // Советская Белоруссия. – 1987. – 9 августа.
8. Гарадоччына ўчора, сёння, заўтра: матэрыялы І Гарадоцкіх краязнаўчых чытанняў, 28 кастрычніка 2007 г. / Гарадоцкі кр. музей; А.М. Дарафееў (адк. рэдактар) [і інш.]. – Гарадок, 2008. – 151 с.

**Е.В. Исакович, Е.С. Устинова**

## ВОЙНА 1812 г. В ЛЕГЕНДАХ И ПРЕДАНИЯХ ВИТЕБЩИНЫ

В памяти народной часто оставляют след яркие исторические события, которые «живут» столетиями в многочисленных легендах и преданиях. Причём число разнообразных произведений в устном народном творчестве, свидетельствует о значимости самих событий (независимо от того, каков они оставили след: позитивный или негативный). Как показывают легенды и предания Витебщины, одним из таких событий стала война 1812 г. В окрестностях города и по сей день можно услышать рассказы о французских солдатах, Наполеоне и кладах этого периода. В данной работе мы попробуем систематизировать их по содержанию, обратив внимание на самые распространённые в местном фольклоре сюжеты.

Одним из самых распространенных на Витебщине сюжетов является рассказ о «французских могилах» (могилах «французских генералов»). Обычно такие легенды возникали в районах нахождения французских войск. В свою очередь на западе республики чаще встречаются легенды о «шведских могилах». Но на самом деле, ни какого отношения «французские могилы» к армии Наполеона не имеют. По традиции так местные жители называют курганные захоронения периода славянской колонизации Беларуси. Так за 1 километр на юго-восток от деревни Большие Сокольники (Мазоловский сельсовет), находится урочище Коховка. Здесь расположено курганное захоронение, которое состоит с 57 насыпей высотой 1–1,5, диаметром 5–7 метров. В 1881 году их исследовал Е. Романов. Местные жители называют их «французскими могилками». Существует легенда, что в 1812 году возле Сокольников была битва, во время которой погибло много французских солдат. Они были похоронены в курганах. Однако современные исследователи утверждают, что в курганах захоронены кривичи, которые жили в VIII–XII веках [1, с. 185–186].

Репозиторий ВГУ